*Источники и литература:*
1. Archiwum Act Nowych (Warszawa). – Zespół 463. Sygn. 61.
2. Decision taken by the Conference of ambassadors with regard to the eastern frontiers of Poland, Paris, March 15, 1923 [Electronic resource]. – Mode of access: http://www.worldlii.org/int/other/treaties/LNTSer/1923/36.html. – Date of access: 13.04.2022.
3. Documents on British Foreign Policy 1919–1939. 1st Ser. / ed. W.N. Medlicott. – London : His Majesty's stationary office, 1984. – Vol. 25. – 970 p.
4. Documents on British Foreign Policy. 1st Ser. / ed. R. Butler. – London : His Majesty's stationary office, 1981. – Vol. 23. – 1026 p.
5. Papers relating to the foreign relation of the United States. 1919. The Paris peace conference : in 13 vol. / Department of state. – Washington, 1943. – Vol. 4. – 880 p.
6. Poland (treatment of Ukranians). 13 May, 1925 [Electronic resource] // House of Commons Debates. – Mode of access: https://api.parliament.uk/historic-hansard/commons/1925/may/13/poland-treatment-of-ukranians. – Date of access: 13.04.2022.
7. Sprawy Polskie na Konferencji Pokojowej w Paryżu w 1919 r. Dokumenty i materiały : w 3 t. / red. K.R. Bierzanek. – Warszawa, 1967. – T. 2. – 483 s.
8. The military situation in Russia, Caucasia, Turkey and Greece. Memorandum by the secretary of state for war, 19th February, 1921 [Electronic resource] // The National Archives. – Mode of access: https://discovery.nationalarchives.gov.uk/details/r/D7737111. – Date of access: 15.04.2022.
9. Traktat między głównymi mocarstwami sprzymierzonymi i stowarzyszonymi a Polską Wersal, 28 czerwca 1919 [Electronic resource]. – Mode of access: https://web.archive.org/web/20140308135112/http://electronicmuseum.ca/Poland_between_Wars/paris_peace_conference/paris_poland_pl.html. – Date of access: 13.04.2022.
10. Wedgwood, J. C. The future of the Indo-British commonwealth / J. C. Wedgwood. – London : Theosophical Publishing House, 1921. – 251 p.
11. Zurowski, M. The British Foreign office and Poland's Eastern minorities, 1918–1941 / M. Zurowski // The Ukrainian Quarterly. – 1990. – № 3. – S. 262–281.

## ДА ПЫТАННЯ АБ УРЭГУЛЯВАННІ МЯЖЫ ПАМІЖ БССР І УССР У 1924–1927 гг.

А.В. Бараноўскі (Мінск)

Актам гістарычнай справядлівасці стала ўз'яднанне ў 1924 г. і 1926 г. усходнебеларускіх тэрыторый з БССР. Афармленне дзяржаўнай мяжы Беларускай рэспублікі з РСФСР, у адрозненне ад урэгулявання мяжы з УССР, грунтоўна адлюстравана ў айчыннай і замежнай гістарыяграфіі. Фарміраванне ж беларуска-ўкраінскай мяжы да апошняга часу заставалася маладаследаваным як беларускімі, так і ўкраінскімі навукоўцамі. Сёння праблема фарміравання мяжы паміж БССР і УССР у 1918–1939 гг. адлюстравана ў публікацыях беларускіх гісторыкаў С. Хоміча [4, с. 279–282], М. Старавойтава [3], Д. Юрчака [5, с. 119–130], украінскага гісторыка права Р. Губаня [2] і іншых даследчыкаў, і тым не менш, асобныя аспекты дадзенай праблемы яшчэ патрабуюць даследавання.

Вясной 1924 г. кіраўніцтвам УССР было ўзнята пытанне аб урэгуляванні беларуска-ўкраінскай мяжы [7]. У красавіку 1924 г. па ініцыятыве кіраўніцтва Украінскай рэспублікі Прэзідыумам ЦВК СССР была створана спецыяльная камісія па ўрэгуляванні мяжы паміж РСФСР і УССР пад старшыньствам А. Чарвякова. На пасяджэнні гэтай камісіі 1 ліпеня 1924 г.

украінская дэлегацыя зрабіла шэраг прапаноў, якія тычыліся ўрэгулявання беларуска-ўкраінскай мяжы, а менавіта: «Украина считает подлежащей включению в состав УССР часть территории бывшей Минской губернии, находящейся на правом берегу р. Словечны, а в состав БССР – включению территории, входящей в настоящее время в состав Украины» [1, с. 402]. На гэтым жа пасяджэнні А. Чарвякоў заявіў, што ўрэгуляванне памежных пытанняў паміж БССР і УССР можа быць зроблена камісіяй у тым жа складзе, які вызначаны для ўстанаўлення межаў паміж УССР і РСФСР. У выніку на камісію быў ускладзены абавязак канчатковага ўстанаўлення беларуска-ўкраінскай мяжы [1, с. 402].

На пасяджэнні Прэзідыума ЦВК БССР 25 ліпеня 1924 г. яго старшыня А. Чарвякоў азнаёміў прысутных з рашэннем надзяліць Камісію ЦВК СССР па ўрэгуляванні мяжы паміж РСФСР і УССР правам устанаўлення беларуска-ўкраінскай мяжы. Абмеркаваўшы дадзенае пытанне, Прэзідыум ЦВК БССР прыняў рашэнне даручыць беларускаму ўраду падрыхтаваць для канчатковага вырашэння тэрытарыяльнае пытанне, што было ўзнята ўкраінскім урадам [10].

На працягу ліпеня 1924 г. гэтае пытанне ў Беларусі стала абмяркоўваца не толькі на савецкім, але і на партыйным узроўнях. 31 ліпеня 1924 г. бюро ЦК КП(б)Б палічыла неабходным прыступіць да ўрэгулявання мяжы паміж УССР і БССР. Прэзідыуму ЦВК БССР было даручана «выделить двух представителей, на которых должна быть возложена работа по подготовке, разработке и даче заключений по затрагиваемым территориям» [6]. 8 жніўня 1924 г. Прэзідыум ЦВК БССР вызначыўся з паўнамоцнымі прадстаўнікамі Беларускай рэспублікі па пытанні аб урэгуляванні беларуска-ўкраінскай мяжы. Інтарэсы Беларусі павінны былі адстойваць Д. Чарнушэвіч і С. Гельтман, а таксама В. Дыла і Я. Кроль, пры адсутнасці першых двух [9, арк. 1].

Цэнтральнай адміністрацыйна-тэрытарыяльнай камісіяй пры Усеўкраінскім ЦВК на пасяджэнні СНК УССР 14 жніўня 1924 г. быў прадстаўлены праект змены беларуска-ўкраінскай мяжы. Патрэбнасць урэгуляванні мяжы паміж УССР і БССР тлумачылася неабходнасцю ліквідаваць выступы, якія ўкліньваліся ў тэрыторыю як Савецкай Украіны, так і Савецкай Беларусі [9, арк. 29]. СНК БССР 8 кастрычніка 1924 г. прыняў пастанову «Об исправлении границы между БССР и УССР» у якой падтрымаў украінскі праект змены беларуска-ўкраінскай мяжы. У сваю чаргу, Прэзідыум ЦВК БССР 10 кастрычніка 1924 г. цалкам падтрымаў вышэйзгаданую пастанову СНК БССР [1, с. 403]. Камісія ЦВК СССР па ўрэгуляванні межаў паміж РСФСР, УССР і БССР 21 кастрычніка 1924 г. таксама пагадзілася з праектам афармлення беларуска-ўкраінскай мяжы, што быў прапанаваны ўкраінскім бокам і падтрыманы беларускім [9, арк. 88].

Пасля ўзгаднення пытання аб урэгуляванні мяжы паміж БССР і УССР на рэспубліканскім узроўні, яно было перададзена на агульнасаюзны ўзровень. Толькі праз год, 16 кастрычніка 1925 г. Прэзідыум ЦВК СССР прыняў пастанову «Аб урэгуляванні мяжы УССР з РСФСР і БССР», тым

самым зацвердзіўшы вышэйзгаданы праект змены беларуска-ўкраінскай мяжы. Прэзідыумам ЦВК СССР было таксама прынята рашэнне аб спыненні дзейнасці сваёй камісіі па ўрэгуляванні межаў і аб арганізацыі парытэтнай камісіі, на якую ўскладалася прыёмка і перадача тэрыторыі, размеркаванне маёмасцей, крэдытаў і інш. [12, арк. 4–6].

Пастановай Прэзідыума ЦВК БССР ад 6 лістапада 1925 г. у склад парытэтнай камісіі па ўрэгуляванні мяжы паміж УССР і БССР ад Беларусі былі дэлегаваны А. Хацкевіч і Д. Прышчэпаў [13, арк. 3]. Малы прэзідыум Усеўкраінскага ЦВК 23 лютага 1926 г. у склад парытэтнай камісіі ад УССР дэлегаваў Канатопа і Фядотава [13, арк. 2]. Старшынёй жа камісіі быў прызначаны старшыня камісіі ЦВК СССР па раянаванню С. Тер-Габрiэлян [11].

Вясной 1926 г. была створана Прыёма-здатачная камісія па прыёме і здачы тэрыторый, якія адыходзяць ад УССР да БССР і ад БССР да УССР (далей Мазырска-Корасценская прыёма-здатачная камісія), куды ўваходзілі па два прадстаўнікі з беларускага і ўкраінскага бакоў. 19 сакавіка 1926 г. камісіяй быў складзены акт аб удакладненні межаў паміж Мазырскай акругай БССР і Корасценскай акругай УССР. Згодна акту беларуска-ўкраінскае тэрытарыяльнае пытанне павінна было вырашыцца наступным чынам: «1. Территорию, подведомственную Засинцовскому сельсовету южной части Каролинского района Мозырского округа с 20-ю населенными пунктами и 2171 душ. населения <…>, как территориально вклинившуюся при наличии экономического тяготения населения к городу Овручу передать Овручскому району Коростенского округа УССР. 2. Ввиду того, что деревня Войткевичи целиком отошла к Польше, а оставшаяся часть территории без населенных пунктов согласно установленной новой границы от впадения реки Купели в реку Студенку и далее вблизи уроч. Погребище, Курган, Каменица, Плоска и Ясное с передачей БССР остается территориально узко-вклинившейся в Олевский район УССР, а посему Комиссия считает означенную территорию оставить за Олевским районом в старых границах. 3. Северную часть территории Олевского района УССР с деревнями: Копище и Майдан с населением 2500 душ и площ. земли 9972 дес. по границе уроч. Кривульки у острова Козьи Ноги, принимая во внимание самостоятельное существование Копищанского сельсовета и окаймленность его течением реки Уборть, Комиссия считает необходимым Копищанский сельсовет оставить самостоятельным сельсоветом с присоединением к Лельчицкому району Мозырского округа БССР. 4. Северная часть территории Словечанского района УССР с дер. Жидова и хут. Пласток, Малашки и Поросля с числом дворов 63 и 348 душ населения с площ. земли 12 000 дес. по границе от уроч. Антоновский Остров и дальше на уроч. Большая Речица, Толкачи, Брод, Смолково, Воронов, Дуплиха, Кожушница и Свинорой до уроч. Жидова передать Лельчицкому району Мозырского округа путем присоединения данной территории к сельсоветам. Комиссия считает необходимым поручить Лельчицкому РИКу и Мозырскому окрисполкому выяснить тяготения населения данной территории на предмет окончательного присоединения к соответствующим сельсоветам. 5. Северная часть территории Овручского района УССР, выражающаяся

в лесной площади около 219 дес., которая лежит на левом берегу реки Словечно между деревнями Новая Рудня и Гажин, передать Головчицкому лесничеству Мозырского округа БССР» [13, арк. 11–12].

Мазырска-Корасценская прыёма-здатачная камісія 8 красавіка 1926 г. удакладніла 5 пункт вышэйзгаданага акта: «установить государственную границу между УССР и БССР в части передаваемой территории части Овручского района Коростенского округа к БССР следующим порядком: от пересечения бывшей границы между Волынской и Минской губерниями, рекой Словечно по течению последней с Запада на Восток» [1, с. 327–328]. Здавалася б, тэрытарыяльнае пытанне паміж рэспублікамі было вырашана канчаткова і варта толькі правесці пастанову ЦВК СССР у жыццё, але гэта было не зусім так.

Член камісіі ад УССР І. Нарадзіцкі на наступны дзень накіраваў у Цэнтральную адміністрацыйна-тэрытарыяльную камісію пры Усеўкраінскім ЦВК дакладную запіску аб узбуджэнні хадайніцтва перад ЦВК СССР аб адмене яго пастановы адносна ўрэгулявання ўкраінска-беларускай мяжы. Неабходнасць узбуджэння хадайніцтва тлумачылася наступнымі абставінамі: «Если провести границу между УССР и БССР по линии, указанной в постановлении ЦИК СССР, население передаваемых хуторов и селений лишается основного источника существования – сенокосов, которые находятся на расстоянии 20–30 верст по одну и другую сторону вновь проводимой границы» [13, арк. 15].

Цэнтральная адміністрацыйна-тэрытарыяльная камісія, а затым і сам Усеўкраінскі ЦВК дэталёва азнаёміліся з дакладной запіскай І. Нарадзіцкага. У выніку было прынята рашэнне накіраваць у ЦВК БССР запыт з мэтай высветліць стаўленне беларускага боку да пытання земляўпарадкавання тэрыторый, што перадаваліся паміж рэспублікамі [13, арк. 14]. ЦВК БССР на сваім пасяджэнні 26 чэрвеня 1926 г. разглядзеў запыт Усеўкраінскага ЦВК і заняў наступную пазіцыю: населеныя пункты адыходзяць са ўсімі землямі, якімі да гэтага часу карысталася насельніцтва, а ў выпадку глыбокага ўклінівання ў тэрыторыю другой рэспублікі лічыць, што пытанне аб мэтазгоднасці перадачы павінна быць абмеркавана яшчэ раз [13, арк. 16].

У чарговы раз разглядзеўшы беларуска-ўкраінскае тэрытарыяльнае пытанне, Парытэтная камісія па ўрэгуляванні межаў паміж РСФСР, УССР і БССР 4 лістапада 1926 г. прыйшла да высновы аб неабходнасці захавання мяжы паміж рэспублікамі ў тым выглядзе, у якім яны знаходзіліся да прыняцця пастановы Прэзідыума ЦВК СССР ад 16 кастрычніка 1925 г. Адразу пасля пасяджання парэтнай камісіі ў СНК БССР і СНК УССР былі накіраваныя запыты з мэтай высветліць стаўленне ўрадаў да адмены вышэйзгаданай пастановы ЦВК СССР [13, арк. 53].

Беларускі бок лічыў беларуска-ўкраінскае тэрытарыяльнае пытанне канчаткова не вырашаным. Гэты тэзіс падкрэсліваўся на пасяджэннях Прызідыума ЦВК БССР 27 лістапада і 11 снежня 1926 г. У сувязі з гэтым праца па канчатковаму вывучэнню пытання аб межах паміж БССР і УССР даручалася наркаматам унутраных спраў і земляробства БССР [13, арк. 49, 51].

Наркамат унутраных спраў БССР 16 лютага 1927 г. праінфармаваў ЦВК БССР адносна паўторнага вывучэння пытання аб урэгуляванні беларуска-украінскай мяжы. У выніку была пацверджана, мэтазгоднасць выканання пастановы Прэзыдыума ЦВК СССР ад 16 кастрычніка 1925 г., аднак толькі пасля правядзення з боку БССР і УССР земляўпарадкавання ва ўсіх насельных пунктах, якія прылягалі да новай мяжы [13, арк. 106]. 5 сакавіка 1927 г. ЦВК БССР прыняў канчатковую пастанову аб правядзенні беларуска-ўкраінскай мяжы: «Просить ЦИК Союза ССР оставить в силе постановление свое от 16 октября 1925 г. с тем, чтобы проведение на практике новой границы осуществлялось постепенно, вместе с проводимым землеустройством по этой границе со стороны БССР и УССР» [12].

Прэзідыум ЦВК СССР на сваім пасяджанні 25 лістапада 1927 г. разглядзеў пытанне аб урэгуляванні мяжы паміж БССР і УССР і прыняў пастанову, у якой пацвердзіў сваё рашэнне ад 16 кастрычніка 1925 г. Усеўкраінскаму ЦВК і ЦВК БССР даручалася правесці яе ў жыццё, папярэдне надзяліўшы жыхароў памежных тэрыторый зямлёй [4, с. 281]. Толькі з прыняццем дадзенай пастановы быў завершаны працэс афармлення мяжы паміж рэспублікамі.

Такім чынам, на працягу 1924–1927 гг. адбывалася карэкціроўка беларуска-ўкраінскай мяжы. Неабходнасць яе ўрэгулявання была выклікана адміністрацыйна-гаспадарчымі прычынамі. Тэрытарыяльныя змены не аказвалі прынцыповага ўплыву на тэрытарыяльнае ўладкаванне савецкіх рэспублік.

*Крыніцы і літаратура:*


1. Государственные границы Беларуси : сб. документов и материалов : в 2 т. / сост.: В.Е. Снапковский [и др.]. – Минск : БГУ, 2012. – Т. 1. : (март 1917 – ноябрь 1926). – 495 с.
2. Губань, Р.В. Правовое регулирование украинско-белорусской государственной границы в 1918–2010 гг. / Р.В. Губань // Актуальные проблемы науки XXI века : сб. науч. ст. молодых ученых / Минский ун-т управления. – Минск, 2014. – С. 9–13.
3. Старовойтов М.И. Формирование межгосударственной белорусско-украинской границы (1918–1929 годы) / М.И. Старовойтов // Дзяржаўнасць Беларусі ў ХХ стагоддзі : да 100-годдзя абвяшчэння Беларускай Народнай Рэспублікі і Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі : зборнік навуковых артыкулаў / Установа адукацыі «Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Францыска Скарыны». – Гомель, 2019. – С. 62–74.
4. Хомич, С.Н. Территория и государственные границы Беларуси в ХХ веке: от незавершенной этнической самоидентификации и внешнеполитического произвола к современному status quo / С.Н. Хомич. – Минск : Экономпресс, 2011. – 415 с.
5. Юрчак, Д.В. Беларусь – Украина : 20 лет межгосударственных отношений : монография / Д.В. Юрчак. – Витебск : УО «ВГУ им. П.М. Машерова», 2012. – 279 с.
6. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (далей – НАРБ). – Ф. 4п. Воп. 1. Спр. 1277. Арк. 299.
7. НАРБ. – Ф. 6. Воп. 1. Спр. 301. Арк. 311.
8. НАРБ. – Ф. 6. Воп. 1. Спр. 298.
9. НАРБ. – Ф. 6. Воп. 1. Спр. 349.
10. НАРБ. – Ф. 6. Воп. 1. Спр. 351. Арк. 378.
11. НАРБ. – Ф. 6. Воп. 1. Спр. 566. Арк. 80.
12. НАРБ. – Ф. 6. Воп. 1. Спр. 1241. Арк. 14.
13. НАРБ. – Ф. 34. Воп. 1. Спр. 805.